# Творчая сустрэча з лаўрэатамі прэміі "За духоўнае адраджэнне"

**17.02.2016**

**Культура**

**Шчыра запрашаем Вас наведаць творчую сустрэчу з лаўрэатамі прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь “За духоўнае адраджэнне” і спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва 2015 года. Сустрэча пад назвай “Брамы памяці” адбудзецца 18 лютага ў 16.00 у галерэі “Ракурс” Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі (пр-т Незалежнасці, 116, 2-гі паверх).**

Наведвальнікаў мерапрыемства чакае знаёмства са стваральнікамі кнігі-рэквіема “Жыць і помніць” Аленай Харашэвіч і Анатолем Шарковым; аўтарам манумента “Брама памяці” мемарыяльнага комплексу “Трасцянец” Канстанцінам Касцючэнка; стваральнікамі гісторыка-дакументальнага серыяла “Яны спявалі за Радзіму” Наталляй Бардзілоўскай, Алегам Даўгаполавым і Міхаілам Равуцкім; калектывам Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.